*ВІНШУЕМ*

# ПЕРАМОГІ, ДЫПЛОМЫ, ПРЫЗЫ

**Шаноўныя сябры! Чарговы выпуск нашай самай важнай і ўрачыстай рубрыкі – віншавальнай – паведамляе пра поспехі нашых калег па абласной пісьменніцкай арганізацыі на рэспубліканскім і міжнародным узроўнях. Давайце іх павіншуем!**

Дыпломы і прызы – падпіскі на 2-гі квартал 2023 года на газету «Звязда» – атрымалі беларускія празаікі, пераможцы Рэспубліканскага конкурсу апавяданняў «Звязды». Сярод іх – старшыня ГрАА СПБ Людміла Антонаўна КЕБІЧ (III месца, апавяданне «Шнары»). Узнагароды лаўрэатам на днях уручыў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар-галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч (*на фота*). Падрабязнасці паведамляе сайт «Звязды».






***

Другое месца ў міжнародным паэтычным конкурсе «Пушкинская лира» (ЗША) заняў член Саюза пісьменнікаў Беларусі, член Саюза пісьменнікаў Расіі, паэт Аляксандр МАРОЗАЎ (Астравецкі раён). Як паведаміў нам Аляксандр Іванавіч, спаборніцтва літаратараў з розных краін свету праводзілася Міжнародным таварыствам пушкіністаў. Арганізацыя была створана шмат гадоў таму ініцыятыўнай групай рускіх эмігрантаў для правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў, прысвечаных вобразу і творчасці А. С. Пушкіна, з мэтай больш актыўнай папулярызацыі і распаўсюджвання рускай культуры па ўсім свеце. Конкурс праводзіўся ўжо ў трыццаць першы раз. Наш калега стаў яго лаўрэатам са сваім вершам «Радуга» («Вясёлка»).


ВТОРОЕ МЕСТО

Международное Общество Пушкинистов

присуждает

г-ну Морозову Александру

За стихотворение

«РАДУГА»

в тридцать первом Поэтическом конкурсе «Пушкинская Лира»

Президент МОП Валентина Цырульникова

28 Января 2023 года



***

***Дарагія сябры!***

***Поспех кожнага з нас спрыяе ўмацаванню пазіцый літаратурнай сям’і Прынёмання, служыць крыніцай радасці і натхнення. Няхай менавіта так і ніяк інакш будзе заўсёды. Ад імя калектыву Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі сардэчна віншуем нашых калег Людмілу Антонаўну Кебіч і Аляксандра Іванавіча Марозава з іх творчымі перамогамі і атрыманнем узнагарод. Жадаем ім моцнага здароўя, невычэрпнай творчай энергіі і новых дасягненняў.***

***Вы – наш гонар!***

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
Гродна

